View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Repository of Vitebsk State University P. M. Masherov

- жыццё і смерць (“Над прасторамі зямлі”, “Страказа”);
- страта сувязі з роднымі каранямі (“Крыніца”, “Хмарка”);
- калектыўнае і індывідуальнае (“У чым іх сіла”, “Супраць вады”);
- мастак і мастацтва (“Ноч, калі папараць цвіце”, “Купальскія светлякі”, “Кучаравае дрэва”).

Стыль апавяданняў Якуба Коласа “вызначаецца лірычнай узнёсласцю. Тут выразна гучыць аўтарскае “я”, эстэтычныя ацэнкі рэчаіснасці, філасофскія разважанні даволі часта падаюцца ў маналогу аўтара, які непасрэдна прысутнічае ў казцы” [2, с. 173].

“Казкі жыцця” змяшчаюць афарыстычныя выслоўі, у якіх закладзена народная мудрасць, жыццёвыя арыенціры, карысныя парады. Напрыклад: “Калі дабро цэлы век застаецца без усякай змены, дык яно перастае быць дабром” [3, с. 116], “Чым часцей даведваюцца да нас нягоды, тым глыбей пачуванне цаны жыцця, тым ясней яго светлыя моманты” [3, с. 120], “У сваім родным кутку работы досыць для кожнага” [3, с. 125], “Лепш быць няшчасным, але відушчым, чымся шчаслівым, ды сляпым” [3, с. 130], “І ніхто няхай не забывае, што ён частка вялікай прыроды” [3, с. 137], “Не воля аднаго, а воля ўсіх толькі і можа мець сілу і права” [3, с. 139], “Толькі тая веда робіцца нашым сталым здабыткам, калі мы даходзім да яе, здабываем яе самі” [3, с. 167],”Усюды і ва ўсім трэба мець розум і ведаць меру” [3, с.205], “На свеце ёсць шмат прытульных куточкаў і сховішч, дзе можна перачакаць і схавацца ад розных нягодаў” [3, с. 215] і іншыя.

**Заключэнне.** Такім чынам, “Казкі жыцця” Я. Коласа маюць алегарычны змест, вызначаюцца надзённасцю праблематыкі, вырашаюць пытанні маральнага, філасофскага, сацыяльнага зместу. За канкрэтнымі вобразамі казак бачацца прадстаўнікі тагачаснага асяроддзя. Жанр алегарычнай навелы дапамог пісьменніку раскрыць самыя значныя тэмы, якія хвалявалі яго. Творы Коласа выконваюць выхаваўчую, пазнавальную ролю, напоўнены шматлікімі афарызмамі.

Літаратура

1. Вялікі пясняр беларускага народа: зборнік артыкулаў аб жыцці і дзейнасці Якуба Коласа. – Мінск: Выдавецтва Акадэміі Навук БССР. – 1959. – 457 с.
2. Гальмакоў, Д. І. Стыль прозы Якуба Коласа /Д. І.Гальмакоў. – Мінск: Выдавецтва БДУ. –224 с.
3. Колас, Я. Песні жальбы; Казкі жыцця /Я. Колас; прадм.У. Гніламёдава, М.Мушынскага. – Мінск: Мастацкая літаратура.– 2008. – 230 с.

## УЛАСНЫЯ АСАБОВЫЯ ІМЁНЫ Ў ЗАГАДКАХ

***Шакінка К.В.***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Семянькова Г.К., канд. філал. навук, дацэнт

Аналіз уласных асабовых імён у загадках паказвае, што народ пры выбары такіх найменняў арыентаваўся на рэальны анамастыкон часу. У загадках ужываюцца як поўныя, так і бытавыя, памяншальна-ласкальныя, скарочаныя формы імён. Праз выбар імён прасочваецца нацыянальна-акрэсленая і эстэтычная пазіцыя аўтара загадкі, мэтанакіраванасць, моўная культура, асацыятыўна-стылістычная вынаходлівасць, якія, як правіла, праяўляюцца пры ўдалым выбары імені.

Актуальнасць нашага артыкула ў тым, што ў ім упершыню паказана функцыя ўласных асабовых імён у такім малым фальклорным жанры, як загадка.

Мэта артыкула – выяўленне ролі антрапонімаў у загадках.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужыла картатэка, сабраная аўтарам з фальклорных твораў [1–5]. Выкарыстаны апісальны метад даследавання.

**Вынікі і абмеркаванне.** У загадках уласныя асабовыя імёны нярэдка выконваюць рыфмастваральную функцыю. Напрыклад, жаночае імя *Алёна* ў загадцы пра бярозу рыфмуецца з прыметнікам *зялёна*: *Стаіць Алёна – хустка зялёна. Тонкі стан, белы сарафан* (бяроза) [4, с. 32].

Гэтае ж імя ў форме *Алёнка* ў загадцы пра цыбулю рыфмуецца з назоўнікам *пялёнкі: Сядзіць Алёнка ў сямёх пялёнках, хто яе абідзіць, той сцягі не ўвідзіць* (цыбуля) [1, с. 76].

Загадкі пра цыбулю маюць некалькі рыфмастваральных уласных найменняў, якія ўтвараюць адпаведныя пары: Хадоська – валоссі, Эльжуха – у кажухах, Маруся – у кажусе, Марушка – у кажушках: *Сядзіць Хадоська, растрапаўшы валоссі. Хто мінае – той аскубае* (зялёная цыбуля) [4, с. 38]; *Прыйшла Эльжуха ў сямі кажухах* (цыбуля) [1, с. 77]; *Сядзіць Маруся ў чырвоным кажусе, хто ўбача, той заплача* (цыбуля) [1, с. 76]; *Ішла Марушка ў дзевяці кажушках, і хто на яе ўзгляне, той заплача* (цыбуля) [1, с. 77].

Рыфмастваральную функцыю выконваюць таксама мужчынскія імёны Піліп, Янук, Пятрок, Пахом, Давыд, Лявон і інш.: *Румяны Піліп да палкі прыліп* (яблык) [3, с. 50]; *У нашага Янука, доўгая рука* (калодзеж) [3, с. 67]; *Пятрок ля варот цяпло ўвалок, сам не бяжыць, а стаячых не любіць* (мароз) [1, с. 43]; *Сядзіць Пахом на носе вярхом, сам не чытае, а мне памагае* (акуляры) [1, с. 214]; *Стаіць Давыд, калом прыбіт; яму даеш і кланяешся, а ён усё просіць (жорны)* [1, с. 213]; *Матушка харатушка, а сын Лявон пайшоў вон* (печ, дым) [1, с. 206].



Репозиторий ВГУ

Найбольш ужывальным мужчынскім імем у загадках з'яўляецца онім *Рыгор* (намі зафіксавана 8 загадак з гэтым імем), які, як і ў папярэдніх прыкладах, нярэдка служыць рыфмастваральным кампанентам: *Стаіць Рыгор паміж гор, кіямі апёршыся* (азярод) [1, с. 171].

Няма сумнення, што ў прыведзеных вышэй прыкладах імя падбіралася для рыфмавання яго з сэнсава значымым, характарыстычным для адгадкі словам наўмысна, каб загадка гучала "складна" і добра запаміналася.

Заўважаецца яшчэ адна асаблівасць загадак – своеасаблівы іх гукапіс, які ў шматлікіх прыкладах служыць падказкай для адгадвання загадкі. Напрыклад, загадкі з іменем *Рыгор*, якія ўтрымліваюць гукі [г] і [р], маюць адгадкі з гэтымі ж самымі гукамі або іх спалучэннем: *Ляжыць Рыгор паміж разор, радзюжкаю закрыты* (гарбуз) [4, с. 36]; *Паміж гор стаіць Рыгор, капелюшом накрыты* (грыб) [1, с. 70]; *Ляжыць Рыгор паміж гор, а як устане – неба дастане* (дарога) [1, с. 269]; *Ляжыць Рыгор паміж гор, лапушком накрыты* (агурок) [1, с. 66].

Адзначанае вышэй назіраем таксама ў загадках з іншымі ўласнымі імёнамі – Кандрат, Ягор: *Кандрат, мой брат, скрозь зямлю прайшоў, чырвоную шубку найшоў* (бурак) [1, с. 66]; *Мой братка, Кандратка, скрозь зямлю прайшоў, красну шапачку найшоў* (мак) [1, с. 88]; *Малады Ягор сеў на конь, паехаў у агонь* (гаршчок) [1, с. 231]; *Між гор мёрзне Ягор панчохай накрыты* (гарох у стручку) [2, с. 45]; *Узойдзе Ягор на бугор – вышэй лесу, вышэй гор, з бугра спускаецца – з вачэй хаваецца* (сонца) [1, с. 24].

Імя *Саламон* мае сугучча з адгадкай *соль: Глінскі біўся з Бульбінскім, а без Саламона і суду няма* (бульба варыцца без солі) [1, с. 193].

У загадках з адгадкамі *ружжо, стрэльба* ўжыванне імён *Трахім, Мартын* з'яўляецца, на наш погляд, таксама не выпадковым. Выкарыстанне ў імёнах спалучэнняў [тр] і [рт] стварае ўражанне трэску, выстралу; акрамя гэтага, імя *Трахім* сугучнае з дзеясловам *трах*, які таксама ілюструе выстрал: *Сухі Трахім далёка б'е* (стрэльба) [1, с. 173]; *Цвёрды Мартын далёка плюе* (ружжо) [1, с. 173]. Да таго ж імёны маюць пры сабе пастаянныя эпітэты *сухі, цвёрды* – сухім павінен быць порах.

Кароткае аднаскладовае ўласнае імя *Ціт* сваёй структурай і наборам гукаў нагадвае піск камара. Адгадкай якраз і служыць назва гэтага насякомага: *Стаіць Ціт у траве, па калена ў крыве* (камар) [1, с. 150].

У загадцы пра пчол, дзе ўжываецца імя *Улляна*, таксама назіраецца своеасаблівы гукапіс (Ульяна – вулей, пчолы), які можна лічыць падказкай для адгадкі: *Ішоў я каля Ульянінага двара, апанавалі мяне сабакі – ні абараніцца, ні куском хлеба адманіцца* (пчолы) [1, с. 122].

Склад *ра* ў імені *Рася* ў загадцы пра дарогу стварае ўражанне даўжыні, працягласці, бясконцасці: *Ішла Рася – расцягнулася, каб устала, дык да неба дастала (дарога)* [4, с. 16].

Уласныя імёны могуць выкарыстоўвацца як сродак адрознення рэалій, намёк на родавую прыналежнасць: *Дзве Гапкі, трэці Гапон* (дзве лаўкі і стол); *За гарою крамяною, суха Ева плача* (скрыпка) [1, с. 291].

**Заключэнне.** Такім чынам, выбар уласнага асабовага імені ў загадках не з'яўляецца выпадковым: у значнай колькасці прыкладаў імя служыць для стварэння рыфмы, своеасаблівага гукапісу, які ілюструе пэўную з'яву ці прадмет або з'яўляецца падказкай для адгадкі.

Падлікі выявілі, што ў 63 прааналізаваных намі загадках ужыта 16 жаночых і 50 мужчынскіх уласных асабовых імён (асобныя загадкі ўтрымліваюць па два імені). Колькасная перавага і разнастайнасць мужчынскіх імён відавочная. Некаторыя імёны ўжываюцца ў некалькіх загадках: Рыгор – у 8 прыкладах, Марыля – у 4, Кандрат – у 4, Даніла – у 2, Міхаіл – у 2, Алёна – у 2.

Літаратура


1. Загадкі / НАН Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Склад. М.Я. Грынблат, А.І. Гурскі; Рэд. тома А.С. Фядосік. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск: Бел. навука , 2004. – 363 с.
2. Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі / Склад. Я.Н. Рапановіч. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск: Вышэйшая школа, 1974. – 384 с.
3. Жывая крыніца: вусная народная творчасць / Уклад. М.А. Зелянкова. – Мінск: Юнацтва, 1991. – 271 с.
4. Залаты клубочак: загадкі, лічылкі, скарагаворкі / Уклад. У.А. Васілевіч. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2007. – 95 с.


## ОСОБЕННОСТИ ЖАНРА ЛИТЕРАТУРНОЙ БИОГРАФИИ В XX ВЕКЕ (НА ПРИМЕРЕ РОМАНА ДЖОНА МАКСВЕЛЛА КУТЗЕЕ «В ОЖИДАНИИ ВАРВАРОВ»)


***Шнипова А.С.***

*студентка 2 курса ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*

Научный руководитель – Глазман Л.Я.


Двадцатый век отмечается нарастающей популярностью жанра биографии, существенно изменившегося за последнее столетие. Этот факт подтверждают многие исследователи данного направления: «двадцатый век ознаменовался мощным взлётом интереса к <…> жизнеописанию» [1]. Сказанное обуславливает актуальность нашего исследования.

Цель работы – выявление особенностей жанра литературной биографии XX века.




Репозиторий ВГУ